Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 198 (28308)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пакуль тата на здымках...



У разводах вінаватыя жанчыны?




Чаму не варта ганяцца за сенсацыяй

СТАР. 15

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ія МАЛКІНА, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Сёння мы разам з Міністэрствам энергетыкі рэалізуем досыць вялікую колькасць праектаў, якія дазваляюць гаварыць аб станоўчым перспектыўным развіцці энергетычнай галіны ў цэлым. Мы, безумоўна, адзначаем істотны экалагічны эфект ад увядзення Беларускай атамнай электрастанцыі. Эканоміка, энергетыка, экалогія — гэта тры кіты, якія ляжаць у аснове ўстойлівага развіцця любой дзяржавы, і Беларусь не з'яўляецца выключэннем».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9189 | ▲ |
| Еўра | 2,1187 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0306 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X



Фота БЕЛТА.

Восень — сезон сельскагаспадарчых кірмашоў. Шмат з іх праходзіць цяпер у сталіцы. У Мінску валанцёры руху «Добрае Сэрца» ў межах акцыі БРСМ дапамагалі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны давезці дадому пакупкі, набытыя на кірмашы.Фота зроблена на адной з гандлёвых пляцовак — каля мінскага Палаца спорту.



# Ураджай з дастаўкай

■ Парламенцкі дзённік

## ДЗВЕ ПРАГРАМНЫЯ МЭТЫ —

### рэалізаваць рашэнні Усебеларускага сходу і мабілізаваць кадры — пастаўлены перад шостым скліканнем Савета Рэспублікі

**Учора на першай сесіі верхняй палаты парламента быў выбраны Прэзідыум. Старшынёй стаў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, намеснікам — Марыяна ШЧОТКІНА. Таксама адбыліся выбары кіраўніцтва пастаянных камісій. Старшыні камісій абазначылі задачы, якія стаяць перад Саветам Рэспублікі.**



Фота БЕЛТА.

### СТАТЫСТЫЧНЫ ЗРЭЗ

У шостым скліканні 56 чалавек выбраны, а адзін назначаны Прэзідэнтам. Сярод 57 сенатараў 30% — жанчыны. Восем членаў ужо працавалі ў мінулых скліканнях. Традыцыйна ў верхнюю палату прайшлі найбольш аўтарытэтныя прадстаўнікі грамадства. 25 членаў маюць дзяржаўныя ўзнагароды, дзесяць — ганаровыя званні, 15 — вучоную ступень ці вучонае званне, сярод іх ёсць два члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і 8 прафесараў.

СТАР. 2

■ Асоба

Аляксандр БАГДАНОВІЧ:

## «Варыянтаў з вяртаннем няма»

### Як алімпійскі чэмпіён пакідае спорт і пачынае новае жыццё

**Біяграфія Аляксандра Багдановіча добра б легла ў аснову якога-небудзь неблагога фільма. У яго жыцці быў як поспех, які прыйшоў яшчэ ў маладым узросце, так і пот, боль і кроў, без якіх сёння немагчымы прафесійны спорт. За плячыма ўжо былога атлета — тры Алімпіяды і медалі ўсіх топ-турніраў, якія толькі магчымыя ў веслярным спорце. Гульні ў Рыа павінны былі стаць апошнімі ў яго кар'еры і закругліць гісторыю самага паспяховага канаіста краіны, аднак удзельнічаць у іх не давялося. У інтэрв'ю «Звяздзе» Аляксандр Віктаравіч расказвае, як прыйшлося перажываць беспадстаўнае адхіленне ад Алімпіяды, куды выдаткаваў свае першыя прызавыя і чаму пасля завяршэння спартыўнай кар'еры вырашыў стаць дэпутатам.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Аляксандр Віктаравіч, перад Алімпійскімі гульнямі 2016 вы казалі, што гэты старт стане для вас апошнім. Нічога не змянілася?***

— Не, маё рашэнне застаецца ранейшым, нягледзячы на тое, што Гульняў для мяне не было. Варыянтаў з вяртаннем у вялікі спорт няма, хіба толькі ў ролі кансультанта, калі беларускаму веславанню недзе трэба будзе дапамагчы, я зраблю гэта з задавальненнем. Хоць цяпер у нас дастаткова спецыялістаў, якія разбіраюцца ў гэтай справе. У мяне была мэта — выступіць на Алімпійскіх гульнях, я ішоў да яе ўвесь гэты час, каб там завяршыць сваё выступленне. Як паказвалі вынікі сёлетняга сезона, мы знаходзіліся ў вельмі добрай форме і рэальна прэтэндавалі на медалі, але абставіны не далі нам пазмагацца за ўзнагароды.

***— Зараз падтрымліваеце фізічную форму?***

— Так, трэніруюся трохі, спрабую сябе ў розных відах спорту. Сына ваджу па ўсякіх секцыях, каб паказаць, якія ёсць варыянты, дзе можна паспрабаваць сябе, і разам з ім пазнаю нешта новае.

СТАР. 4